*Гаўрылава С.В.*

# Асноўныя кірункі аднаўлення і развіцця г. Полацка ў 1944–1954 гг. Частка 1. Першыя крокі на шляху аднаўлення. Прамысловасць

За час, пакуль доўжылася Вялікая Айчынная вайна, народная гаспадарка Полацка моцна пацярпела. Нават тыя прадпрыемствы, што працягвалі поўнасцю або часткова працаваць у перыяд акупацыі, былі знішчаны падчас адступлення нямецкіх войскаў у ліпені 1944 г. У горадзе не засталося ніводнага працуючага прадпрыемства, камунальная гаспадарка прыйшла ў заняпад.

Пасля вызвалення ў Полацк пачалі вяртацца мірныя жыхары, прыбываць вайскоўцы і чыгуначнікі. З першых дзён пачаліся работы па аднаўленні вузла сувязі, шляхоў зносін з іншымі рэгіёнамі. Аднаўленчыя часці пабудавалі часовы чыгуначны мост праз Заходнюю Дзвіну, зрабілі чыгуначны мост праз Палату. На месцы спаленага Чырвонага моста быў узведзены часовы пешаходны.

З часу вызвалення да 1946 г. канторай сувязі была адноўлена міжгародняя кабельная сетка і абсталявана міжгародняя тэлефонная станцыя, а таксама абсталявана і пушчана новая тэлефонная станцыя «ЦБ» на 360 нумароў, праведзена 12 км тэлефонных ліній, прывешана 68 км тэлефонных правадоў, арганізаваны ўсе віды паштовых аперацый. Аднак яшчэ доўгі час ва ўстанаўленні сувязі заставалася шмат цяжкасцяў: на адной лініі былі падключаны па 3–4 абаненты, значная частка арганізацый і прадпрыемстваў увогуле не мела тэлефоннай сувязі, паштовая карэспандэнцыя дастаўлялася не ў тэрмін, дапускалася скажэнне тэкстаў тэлеграм, якасць абслугоўвання насельніцтва тэлефаністкамі і аперацыйнымі касірамі была нізкай [**8**].

З усіх відаў транспарту першым быў адноўлены чыгуначны. Ужо ў жніўні 1944 г. былі наладжаны рэгулярныя чыгуначныя зносіны: адзін раз у суткі хадзіў цягнік да Віцебска [**11**]. У хуткім часе быў адноўлены і гарадскі аэрадром. Паміж Полацкам і Мінскам летам 1945 г. была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстаноўлена авіялінія, на якой выкарыстоўваліся самалёты з невялікай колькасцю месцаў [**3**].

Першая гарадская электрастанцыя, арганізаваная ў памяшканні былой вадакачкі, дзе быў пастаўлены трафейны дызель з генератарам, пачала даваць ток з 1 верасня 1944 г. [**11**].

Вялікая ўвага гарадскіх улад надавалася аднаўленню камунальнай гаспадаркі. У канцы ліпеня 1944 г. на пасяджэнні гарвыканкама былі прыняты рашэнні аб першачарговых мерапрыемствах па аднаўленні камунальных аб'ектаў – лазні і вадаправода, якія павінны былі запрацаваць меней чым праз месяц, у жніўні.

Наладжвалася сетка кропак грамадскага харчавання і гандлю. Першыя крамы і сталоўка былі арганізаваны на гарадскім рынку, дзе захавалася частка драўляных гандлёвых радоў [**11**]. У канцы лета 1944 г. на сесіі гарадскога Савета дэпутатаў абмяркоўваліся пытанні па аднаўленні сеткі гандлёвых прадпрыемстваў і арганізацыі грамадскага харчавання. Дэпутаты адзначалі, што ў горадзе няма ніводнага памяшкання, падыходзячага для арганізацыі гандлю, за выключэннем 5 крамаў у розных раёнах горада і 1 сталоўкі, але яны лічыліся часовымі. На гэтым жа пасяджэнні разглядалася пытанне пра арганізацыю прамысловых прадпрыемстваў г. Полацка. З моманту вызвалення да гэтага часу ва ўцалелых пабудовах сельгасмайстэрняў па вул. Кастрычніцкай быў арганізаваны Полацкі гарпрамкамбінат, які ўжо адкрыў шавецкую і кравецкую майстэрні, гарбарны завод, кузню, заканчваў будаўніцтва Ксавер'еўскага млына. Каля млына адбудавалі мост праз Палату. Некаторы час ён заставаўся адзінай для транспарту пераправай праз Палату ў горадзе. Гарсаветам было прынята рашэнне аб адкрыцці бляшана-цвіковай вытворчасці, сталярнай майстэрні, стварэнні пры Ксавер'еўскім млыне філіяла лесазавода, аднаўленні сельгасмайстэрні. Ужо ў наступным месяцы рашэнне было выканана амаль цалкам. Да канца 1944 г. быў адкрыты яшчэ шэраг арцеляў і майстэрняў па вытворчасці тавараў шырокага спажывання. У канцы года пачалося будаўніцтва высакаводнага моста праз Заходнюю Дзвіну. Для нарыхтоўкі матэрыялаў Полацкі лясгас адвёў бліжэйшыя лесадзялянкі вайсковай часці [**9**].

Хуткімі тэмпамі ішло аднаўленне прадпрыемстваў і майстэрняў бытавога абслугоўвання насельніцтва, вытворчасці тавараў першай неабходнасці. У 1944 г. пры гаркамгасе запрацавалі кузня і слясарная майстэрня, рабочыя якой збіралі на пажарышчах жалезныя лыжкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднаўлялі іх, рамантавалі замкі, рабілі завесы, кручкі, клямкі і да т.п. [**3**]. З мэтай павелічэння продажу насельніцтву прадуктаў харчавання ў верасні 1944 г. пры гархарчпрамгандлі была створана падсобная гаспадарка. Яе прадукцыя выкарыстоўвалася ў справе наладжвання грамадскага харчавання ў горадзе [**5**]. Да канца года быў створаны Полацкі абласны Дзяржрыбпрамтрэст, якому падпарадкоўваліся Полацкі рыбгас, Казлоўскі і Браслаўскі рыбпрамгасы [**9**].

Асабліва хуткімі тэмпамі горад узнімаўся з руін пасля арганізацыі Полацкай вобласці. З 20 верасня 1944 г. Полацк стаў абласным цэнтрам. Новы адміністратыўны статус аказаў вялікі ўплыў на далейшае жыццё горада, увага партыйных і савецкіх органаў да яго аднаўлення і развіцця стала больш пільнай. У 1945–1946 гг. на аднаўленчыя работы толькі г. Полацку было адпушчана амаль 29 мільёнаў рублёў [**9**].

У пасляваенны час кожны жыхар горада зрабіў свой уклад у адраджэнне Полацка. 18 кастрычніка 1944 г. чарговая сесія гарсавета прыняла рашэнне аб удзеле ўсіх жыхароў горада ў аднаўленні камунальнай гаспадаркі. Удзел палачан у гэтай справе прымаў усё больш масавы характар. На гарадскія нядзельнікі па расчыстцы завалаў выходзілі цэлымі працоўнымі калектывамі. У горадзе праводзілася шмат суботнікаў па зносе непрыдатных каробак, расчыстцы мясцовасці, закладцы сквераў, алей і паркаў. На аднаўленчых работах на прадпрыемствах і чыгуначным вузле, вузле сувязі і іншых аб’ектах працавалі ваеннапалонныя, працоўныя па аргнаборы, жыхары горада, якія ўжо паспелі вярнуцца. Але без тэхнікі расчыстка ішла марудна, хоць на працу выходзілі некалькі сот чалавек. Для правядзення аднаўленчых работ Полацку былі выдзелены не толькі буйныя грашовыя сродкі, горад атрымаў частку дасланага ў БССР з іншых рэспублік прамысловага абсталявання, будаўнічых матэрыялаў. У абласны цэнтр даставілі абсталяванне для дзвюх электрастанцый. Розныя гарадскія службы атрымалі грузавыя аўтамашыны, бензін, коней і г.д. З прыбыццём бульдозераў і экскаватараў справа аднаўлення пайшла хутчэй.

З ліку непрацуючага гарадскога насельніцтва праводзілася мабілізацыя рабочых і возчыкаў з падводамі для работы ў будаўнічамантажных трэстах, а таксама для нарыхтоўкі і вывазкі мясцовых будаўнічых і лясных матэрыялаў. З мэтай забеспячэння горада лесам для будаўніцтва дамоў была ўведзена працагужпавіннасць. На пасяджэнні аблсавета ў снежні 1944 г. дэпутаты, разгледзеўшы пытанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Аб мерапрыемствах па аднаўленні і развіцці мясцовай прамысловасці і прамкааперацыі вобласці на 1945 г.», прынялі рашэнне арганізаваць у І квартале наступнага года вытворчасць дахавых матэрыялаў для забеспячэння аднаўлення будынкаў у г. Полацку [**9**].

Згодна з вынікамі перапісу дробнай прамысловасці Полацка, на 1 студзеня 1945 г. у абласным цэнтры дзейнічалі: вадзяны млын «Ксаверыя» на р. Палата, мясакамбінат, рыбзавод, хлебакамбінат і хлебапякарня, плодавінзавод, 2 электрастанцыі, прамарцель «Чырвоны маяк», друкарня, гарвадаправод, леспрамгас і лясгас, паравознае дэпо ст. Полацк, майстэрні па пашыве адзення і абутку. Сярод працуючых былі адзначаны як зноў адкрытыя, так і часткова адноўленыя прадпрыемствы.

З 1945 г. у Полацк пачалі завозіць трафейныя матэрыялы, абсталяванне за кошт рэпатрыяцыі. У арганізацыі і на прадпрыемствы паступалі электраматэрыялы, кабінетныя падлогавыя гадзіннікі, швейныя машыны, піяніна, а таксама аўтамашыны розных марак. Аўтамабілі канцэнтраваліся ў двары лесатэхнікума і адтуль размяркоўваліся па ўстановах. Так, з 10 аўтамашын, атрыманых для вобласці, 8 былі перададзены Полацкаму аблбудтрэсту [**9**].

Перыяд існавання Полацкай вобласці прыпаў на дзве пасляваенныя пяцігодкі: 4-ю (1946–1950 гг.) і 5-ю (1951–1955 гг.). Іх планы аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі непасрэдна паўплывалі на жыццё Полацка. У верасні 1946 г. восьмая сесія Вярхоўнага Савета БССР першага склікання прыняла «Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946–1950 гг.», дзе былі намечаны больш высокія тэмпы развіцця народнай гаспадаркі БССР, чым па краіне ў цэлым. Планам прадугледжвалася выдзяленне вялікіх сродкаў на аднаўленне разбуранага горада, на наладжванне і далейшае развіццё прамысловасці. Галоўным кірункам пры аднаўленні горада было вызначана пераўтварэнне яго ў прамысловы вузел. У першай пасляваеннай пяцігодцы ў шэрагу задач было аднавіць прамысловасць і пераўзысці даваенны ўзровень ужо к 1950 г. Галоўная задача чацвёртага пяцігадовага плана – адрадзіць з руін і попелу горад, ператварыць яго ў магутны эканамічны і культурны цэнтр вобласці, адзін з прыгажэйшых гарадоў Беларусі.

Задачы па пераадоленні недахопаў першай пасляваеннай пяцігодкі былі прадугледжаны ў плане далейшага развіцця гарадской гаспадаркі. Буйны крок наперад прадугледжваў пяты пяцігадовы план, згодна з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якім у Полацку прадугледжвалася далейшае павелічэнне энергетычнай базы, развіццё новых вытворчасцяў, будаўніцтва завода шкловалакна. Адначасова з гэтым павінна было працягвацца пашырэнне працуючых прамысловых прадпрыемстваў, абсталяванне іх новай тэхнікай.

**Прамысловасць**

Адно за адным прымаліся рашэнні па аднаўленні прадпрыемстваў і арцеляў горада. Пастановай СНК БССР № 123 ад 08.02.1945 г. быў зацверджаны пачатак аднаўлення Полацкага птушкакамбіната. У 1945 г. пачалося аднаўленне плодавінзавода, была адноўлена арцель «Чырвоны возчык», прамарцель «Праўда», якая аб'ядноўвала механічны цэх па вырабу дзвярных і аконных пераплётаў, ложкаў і цэх халоднай апрацоўкі металу, прамарцель сляпых (у сувязі з чым быў праведзены ўлік сляпых па Полацкай вобласці) [**9**].

Для пашырэння вытворчых магчымасцяў прадпрыемствы атрымлівалі дадатковыя грашовыя сродкі і абсталяванне. У ліпені 1945 г. гарпрамкамбінат атрымаў дадатковыя капіталаўкладанні на суму 35 тыс. рублёў для даабсталявання лесазавода і абсталявання гантарэзнага і сталярна-бондарнага цэхаў [**8**]. Асабліва вострай была неабходнасць у абсталяванні для мясакамбіната, хлебакамбіната, плодавінзавода.

У красавіку 1945 г. Полацкі аблвыканкам прыняў рашэнне прыступіць да будаўніцтва ў былым будынку сельгасмайстэрняў НКМП БССР па вул. Кастрычніцкая, 5 ліцейна-механічнага завода. Аднак пачатак работ зацягнуўся амаль да канца года. У лістападзе 1945 г. аблсавет пацвердзіў рашэнне аб будаўніцтве завода і прыняў рашэнне перавезці станкаабсталяванне для завода з Мінска [**9**]. Было атрымана таксама некаторае трафейнае абсталяванне. Аднак хутка планы змяніліся і было вырашана ліцейна-механічны завод пераабсталяваць у завод кос, якіх на той час было вельмі мала, бо выпускаў іх адзін толькі ўральскі завод. Людзей адправілі вучыцца на Урал. Пачалася ўстаноўка адпаведнага абсталявання і яго тэсціраванне. Але нечакана прыйшло рашэнне аб адмене такой рэканструкцыі. Завод кос быў пераўтвораны ў завод сантэхвырабаў і сельгасінвентара [**11**]. Некаторы час яго асноўнай прадукцыяй былі сякеры. Аднак якасць іх была вельмі нізкай. Так, рабочыя, якія працавалі на будаўніцтве гарадскога кінатэатра ў 1948 г., скардзіліся на тое, што сякеры псаваліся так хутка, што праз 5–6 дзён выкарыстання былі ўжо не прыдатныя [**6**].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вясной 1945 г. пачалося будаўніцтва гідраэлектрастанцыі на р. Палата каля Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Для паскарэння тэмпаў яе будаўніцтва аблсавет абавязаў арганізацыі і прадпрыемствы горада некаторы час кожны дзень выдзяляць рабочых з рыдлёўкамі. Аднак будаўніцтва ішло з вялікімі цяжкасцямі. Так, за зрыў будаўнічых работ быў зняты начальнік будаўніцтва, а для аднаўлення работ аблкамгасам былі выдзелены 32 рабочыя, у тым ліку 8 цесляроў з Шаркаўшчыны і 4 – з Відзаў [**9**]. У 1946 г. гідраэлектрастанцыя была пушчана. Меркавалася, што яна будзе даваць пры 2-х турбінах і 2-х генератарах 150–200 кВт/г, але працавала толькі 1 турбіна і давала да 75 кВт/г з-за малога вадазбору. Будаўніцтва гідраэлектрастанцыі не вырашыла праблемы асвятлення дамоў, вуліц і ўстаноў, таму паўстала пытанне пра аднаўленне ЦЭЦ. Прыступілі да рэканструкцыі пабудаванага да вайны будынка. Прыбыло абсталяванне станцыі, але яно не супала з запраектаваным і ляжала некалькі гадоў, пакуль яго не прыбралі. У канцы 1946 г. даў ток першы турбагенератар Полацкай ЦЭЦ магутнасцю 500 кВт. Торф для ЦЭЦ везлі з Обальскага торфазавода і іншых тарфяных прадпрыемстваў вобласці. У дапамогу першай турбіне і генератару даслалі энергацягнік і давялі магутнасць ЦЭЦ да 1500 кВт, а гідраэлектрастанцыя засталася як рэзервовая. Пуск гэтых станцый забяспечыў асвятленне і работу прадпрыемстваў на некаторы час. У наступныя гады працягвалася рэканструкцыя ЦЭЦ з мэтай давесці яе магутнасць да 3000 кВт і больш [**11**].

На 01.05.1945 г. у Полацку ўжо часткова ці поўнасцю былі адноўлены і пачалі вырабляць прадукцыю 12 прадпрыемстваў: мясакамбінат, вінзавод, рыбзавод, хлебапякарня, цагельны завод, 2 электрастанцыі, вадаправод, гарпрамкамбінат, лесазавод, гармалзавод, арцель «Харчавік», арцель «15 год БССР», арцель «Чырвоны пенсіянер», арцель «Чырвоны маяк», ботавая арцель, арцель шырспажыву. Усяго за 1945 г. было выпушчана прадукцыі больш чым на 3,5 мільёнаў рублёў [**8**].

У 1946 г. была арганізавана Полацкая ўтыльная арцель «Перамога». З мая 1946 г. дзейнічаў завод буддэталяў па вул. К. Маркса, 142. У Задзвінні былі пабудаваны майстэрні і інтэрнат аб'яднання сляпых, створаны вяровачная і валёнкавая майстэрні [**8**].

У ліпені 1946 г. у горадзе дзейнічалі 3 хлебапякарні магутнасцю 12 і 9 т у суткі, з якіх № 1 – па вул. Кастрычніцкай, № 2 – у Зялёным гарадку, хлебакамбінат і АПЗ ДН-7 па вул. Валадарскага на 4 т [**8**].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У верасні 1946 г. на пасяджэнні аблсавета разглядалася пытанне аб аднаўленні сродкаў сувязі Полацкай вобласці. Удзельнікамі было прынята рашэнне прыступіць да будаўніцтва Дома сувязі ў Полацку ў пачатку наступнага года і пусціць яго ў эксплуатацыю ўжо ў 1948 г. Планавалася ў адным будынку сканцэнтраваць усе прадпрыемствы і віды сувязі [**9**].

Прампрадпрыемствы горада выканалі план 1946 г. па выпуску валавай прадукцыі на 119 %, у грашовым эквіваленце – амаль на 3,5 мільёна рублёў больш, чым у 1945 г.

У студзені 1947 г. аблсаветам было зацверджана будаўніцтва лесапільнага завода і мэблевага цэха пры арцелі «Парыжская камуна» агульнай магутнасцю 5 тыс. $м^3$ піламатэрыялаў, якія б выпускалі мэблю на 500 тыс. рублёў у год [**9**].

У снежні 1947 г. быў поўнасцю адноўлены Механізаваны хлебазавод. На гэтую справу было затрачана амаль 2 мільёны рублёў, магутнасць завода складала 44 т хлеба ў суткі, аднак вытворчасць была загружана толькі на 50 % [**8**]. Пасля адмены карткавай сістэмы полацкі хлебакамбінат не здолеў наладзіць выпуск у дастатковай колькасці розных гатункаў хлеба. Вырабы былі кіслымі, гарэлымі, цеста – дрэнна замешаным. Камбінат атрымліваў сартавую муку і цукар для выпечкі французскіх булак, саек, піражных, батонаў і інш., але выrабляў іх у невялікай колькасці.

Да канца 1947 г. у горадзе былі адноўлены і пабудаваны 22 прадпрыемствы: цагельны завод, завод будаўнічых дэталяў, рыбзавод, мэблевая фабрыка, гарпрамкамбінат і г.д. [8].

У 1947 г. прамысловасць Полацка выпускала важнейшыя віды прамысловай прадукцыі:

| | |
|---|---|
| цагельны завод № 39 | цэгла-сырэц, посуд ганчарны |
| завод буддэталяў | распілоўка лесу |
| птушкакамбінат | птушка бітая |
| мясакамбінат | мяса, каўбасныя вырабы, субпрадукты |
| малочны завод | масла, смятана, марожанае малочнае, сыркавае масла, шакаладнае малако |
| хлебакамбінат | хлебабулачныя вырабы |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| плодавінзавод | віно і сокі пладова-ягадныя |
| электрастанцыя | электраэнергія |
| рыбзавод | улоў рыбы |
| ліцейна-механічны завод | лыжкі, чыгункі, сякеры, ручкі дзвярныя |
| гарпрамкамбінат | рамонт металшырспажыву, вапна, піламатэрыял, бачкатара, абутак новы, рамонт абутку, швейныя вырабы, гонта, перамол зерня |
| арцель «Харчавік» | вафлі, раслінны алей, каўбаса, віно слабаалкагольнае, марожанае, квас |
| арцель «Чырвоны маяк» | абутак новы, рамонт абутку |
| арцель «15 год БССР» | швейныя вырабы, механічны цэх |
| арцель «Шырспажыў» | ганчарны посуд, валёнкі, вяроўка гаспадарчая |
| арцель «Чырвоны пенсіянер» | абутак новы, рамонт абутку, швейныя і трыкатажныя вырабы, валёнкі, ганчарны посуд |
| арцель «Парыжская камуна» | сталы абедзенныя і пісьмовыя, шафы для вопраткі і канцылярскія, табурэткі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вытворчы план 1947 г. быў перавыкананы, што склала 109,1 % к мінулагодняму плану [**8**].

У 1948 г. былі адноўлены фабрыка індывідуальнага пашыву, другая чарга электрастанцыі на 500 кВт, павялічана магутнасць мясакамбіната, птушкакамбіната, цагельнага завода № 39, арганізавана металаарцель «Праўда» [**8**].

Сетка арцеляў аднавілася ў гэты час на 87 % к даваеннаму ўзроўню: у Полацку працавалі 10 арцеляў [**9**]. Патрабавалася яшчэ аднавіць трыкатажную арцель «8 сакавіка», хімічную, «2-й пяцігодкі», металаарцель «Зорка» [**8**]. Ужо існуючыя арцелі павялічвалі свае вытворчыя магчымасці. Так, арцель «Чырвоны пенсіянер» дадаткова арганізавала шавецкі і кравецкі цэхі, вытворчасць піражных і тортаў; усяго ў гэты час

арцель аб'ядноўвала 15 цэхаў, якія выпускалі валёнкі, вяроўкі, харчовыя прадукты, праводзілі рэстаўрацыю прадметаў хатняга ўжытку.

З усіх арцеляў і прадпрыемстваў да 1948 г. толькі гарпрамкамбінат здолеў поўнасцю аднавіць свае памяшканні; план 1947 г. ён перавыканаў на 165, 2 % і асвоіў новыя віды прадукцыі: косныя брускі, дарную дошку, аднавіў атэлье мод, устанавіў другую пілараму [**8**].

Аднак выпуск прадукцыі арцелямі Полацка вёўся без уліку спажывецкіх запатрабаванняў, да гэтага часу не быў наладжаны выпуск крэму для ботаў, чарніла, воцату, фарбы, прадукцыя заставалася нізкай якасці, але высокай цаны (напрыклад, парты арцелі «Парыжская камуна» не адпавядалі ўзросту, для якога выпускаліся, у той жа час пры нізкай якасці цана складала 186 рублёў); у абласны цэнтр тавары завозіліся з іншых гарадоў: драўляныя вешалкі, кухонныя сталы, сякеры, прасы. Акрамя нізкай якасці прадукцыі, у арцеляў было дастаткова недахопаў, якія не адпавядалі прынцыпам савецкай вытворчасці: надомніцтва, сямейнасць, пранікненне ўласніка і інш. [**8**].

У 1948 г. папоўнілася абсталяванне лесазавода, пачаўся выпуск аконных пераплётаў, дзвярэй, падлогавай дошкі, плінтуса, налічнікаў і інш., на заводзе пастаянна працавалі 316 чалавек, у тым ліку 97 чалавек — моладзь са школ ФЗН [**8**].

Некаторыя прадпрыемствы ўзбуйняліся. Так, з-за знаходжання ў адным памяшканні, аднолькавай маламагутнасці і агульнага кіраўніцтва ў арцель «Чырвоны маяк» аб'ядналіся арцелі «Чырвоны маяк» і «15 год БССР» [**8**].

Абласная друкарня ў 1948 г. пераехала ў адноўленую даваенную пабудову на вул. Сака і Ванцэці. З 1950 г. тут пачалі асвойваць друкаванне каляровай прадукцыі спосабам высокага друку. У студзені 1954 г. у сувязі са скасаваннем вобласці друкарня стала гарадской. Усяго ў горадзе на той час працавалі 109 крамаў і ларкоў [**9**]. Пры арцелі «Шырспажыў» быў адкрыты пераплётны цэх. Цагельны завод перайшоў на круглагадовы рэжым работы замест сезоннага [**8**].

Прамысловасць Полацка за 1948 г. выканала план на 101 %, што склала 130,5 % да паказчыкаў 1947 г. Гэты 1 % быў роўны амаль 3,5 мільёнам рублёў. У лік перадавікоў трапілі гарпрамкамбінат, электрастанцыя, друкарня, арцель «Чырвоны пенсіянер», «Чырвоная вышывальшчыца» [**9**].

На 1949 г. быў запланаваны выраб 48 відаў прадукцыі [**8**]. У кастрычніку 1949 г. прамысловасць горада датэрмінова пераўзышла даваенны

ўзровень сярэднямесячнага выпуску прадукцыі. План 4-х год пяцігодкі быў выкананы на 116 %. Значна пашырыўся выраб цэглы, тавараў шырспажыву, валянага абутку, швейных вырабаў, мэблі і іншай прадукцыі.

У 1950 г. у абласным цэнтры працавалі ўжо ўсе прадпрыемствы, што дзейнічалі ў горадзе да вайны. У Полацку прайшла праверка законнасці існавання арцеляў прамкааперацыі і кааперацыі інвалідаў. У яе ходзе былі выяўлены парушэнні афармлення статутаў і захавання дакуметаў па дзяржрэгістрацыі, у большасці выпадкаў у іх не былі адлюстраваны віды дзейнасці арцелі, груба парушаліся правілы вырабу, захавання і ўліку квітанцый, у асобных арцелях парушаліся ўстаноўленыя нормы суадносін колькасці наёмных рабочых і служачых і непасрэдна членаў арцелі, найбольш гэтыя нормы былі парушаны ў арцелі «Чырвоны пенсіянер» – на 22,7 % перавышала колькасць наёмных, у арцелі «Чырвоная вышывальшчыца» гэтыя лічбы былі роўнымі [**8**].

Увага да аднаўлення абласнога цэнтра, як было адзначана вышэй, была пільнай. Часам мелі месца выпадкі, калі за невыкананне планаў асваення выдзеленых грашовых сродкаў аб’ект пазбаўляўся фінансавання ўвогуле. Так, планам капработ па Полацкім рыбгасе на 1949 г. прадугледжвалася будаўніцтва халадзільніка, вяндлярнага і сушыльнага цэхаў, але ў выніку дрэннага ходу работ адпушчаныя сродкі былі адкліканы Галоўрыбпрамам. На 1950 г. сродкі не адпусцілі, будаўніцтва прыпынілася, з-за чаго прадпрыемства пазбавілася магчымасці захоўваць і перапрацоўваць свежую рыбу, вытворчасць стала нерэнтабельнай [**8**].

У 1952 г. у Полацку працавалі прадпрыемствы і арцелі 19 асноўных галін прамысловасці: хімічнай, паліўнай, паліграфічнай, мастацкай, трыкатажнай, харчасмакавай, швейнай, тэкстыльнай, скураабутковай, сілікатна-керамічнай, мэблевай, дрэваапрацоўчай, металаапрацоўчай і інш. [**1**].

План 1952 г. прамысловасцю горада выкананы на 101,4 %, у т.л. прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці – на 103, 4 %, арцелямі і прадпрыемствамі прамысловай кааперацыі і кааперацыі інвалідаў – на 99,9 %. Выпушчана валавай прадукцыі на 2110,4 тыс. рублёў, што на 14,3 % больш у параўнанні з папярэднім годам. З 20 прампрадпрыемстваў абласнога цэнтра план вытворчасці не выканалі 7, з 9 арцеляў – 2. Горш за ўсіх выйшаў на канец года рыбзавод, які план выканаў на 82,5 % са стратамі ў 65,1 тыс. руб. [**1**].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У разы вырасла заработная плата палачан. Да прыкладу, рабочыя на мясакамбінаце ў 1944–1945 гг. атрымлівалі ў сярэднім 234 руб., у 1952 г. — 6163 руб., на птушкакамбінаце — 172 руб. і 5224 руб. адпаведна, у арцелях гэтыя лічбы склалі 358 руб. і 5583 руб. Сярэдняя заработная плата на прадпрыемствах горада ў гэты час была роўная 6033 руб. Найбольш зараблялі на заводзе буддэталяў — 8606 руб., меней за ўсіх на мотарамонтным заводзе — 3720 руб. [**1**].

Пасля перабудовы кацельнай у 1953 г. магутнасць гарадской электрастанцыі ўзрасла ў 3 разы ў параўнанні з даваенным узроўнем. Станцыя была аснашчана найноўшым абсталяваннем, асноўныя працаёмкія працэсы былі аўтаматызаваны. Электрастанцыя пачала даваць энергію буйным населеным пунктам — Ветрына, Ушачам і калгасам Полацкага раёна [**5**].

Першая палова 1950-х гг. вызначалася павелічэннем выпуску прадукцыі прамысловасцю Полацка, асваеннем новых відаў прадукцыі, далейшай механізацыяй вытворчасці, ростам прадукцыйнасці працы, зніжэннем сабекошту прадукцыі; многія прадпрыемствы забяспечылі сістэматычнае перавыкананне вытворчых планаў, а таксама паспяховае выкананне замоў сельскай гаспадаркі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры і крыніц**


1. Архіў Краязнаўчага музея – філіяла НПГКМЗ.

1) Итоги выполнения народнохозяйственного плана города Полоцка за 1952 год.

2) Сведения о выполнении производственного плана по валовой продукции в неизмен. ценах предприятиями союзно-республиканского, местного подчинения и артелями города Полоцка за октябрь месяц 1948 г.

3) Средняя оплата труда рабочих и служащих предприятий и учреждений города помесячно (руб.) в 1944–1945 гг.

2. Докладная записка по состоянию промышленных предприятий на 1.05.1945 г. // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 18. – Л. 18.

3. Дейнис, И.П. Полоцк в XX веке / И.П. Дейнис // НПГКМЗ. – ПГАЗ КП 5-2774. – С. 210–237.

4. Никитин, Г.А. Возрождение из руин и пепла / Г.А. Никитин // Полоцк: ист. очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) и др. – 2-е изд., перераб и доп. – Минск: Наука и техника, 1987. – С. 225–233.

5. Мелешко, В.И. Город меняет свой облик. Улучшение жилищно-бытовых условий / В.И. Мелешко // Полоцк: ист. очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) и др. – 2-е изд., перераб и доп. – Минск: Наука и техника, 1987. – С. 233–238.

6. Москов, Ф. О качестве топоров / Ф. Москов [и др.] // Большевистское знамя. – 1948. – 8 августа. – С. 2.

7. Переписка с республиканскими, областными и городскими учреждениями по вопросам восстановления и развития городского хозяйства и культуры, улучшения благосостояния трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 57. – Л. 1, 7.

8. Протоколы заседаний исполкома Полоцкого горсовета депутатов трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 12, 50, 52, 64, 65–67, 76–77.

9. Протоколы заседаний исполнительного комитета Полоцкого областного Совета депутатов трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 686. – Воп. 1. – С. 16, 29, 31, 55.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Распоряжение № 25 от 28 апреля 1945 г. // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 686. – Воп. 1. – С. 28. – Л. 29.

11. Яшчэ грымелі баі. З успамінаў І.П. Дэйніса // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 491–493.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ